Источник: "Літаратура і мастацтва" - 2015-01-16

# За духоўнасць!




*Фота БелТА*

*Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка ўручае прэмію загадчыку аддзела Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі Барысу Лазуку.*

**У Палацы Рэспублікі ў Мінску прайшла цырымонія ўручэння прэмій Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «За духоўнае адраджэнне», спецыяльных прэмій дзеячам культуры і мастацтва, «Беларускі спартыўны Алімп».**

Па выніках 2014 года прысуджана пяць прэмій Прэзідэнта Беларусі «За духоўнае адраджэнне». Сярод лаўрэатаў — калектыў Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета Рэспублікі Беларусь, які ўвасобіў нацыянальна-гістарычную тэматыку ў спектаклях і пастаноўку балета «Вітаўт».

Кіраўнік дзяржавы прысудзіў 10 спецыяльных прэмій Прэзідэнта Беларусі. У ліку ўганараваных — аўтарскі калектыў у складзе дацэнта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў Людмілы Дамнянковай, дырэктара творча-эксперыментальнага прыватнага ўнітарнага прадпрыемства «Гударт» Пятра Лабковіча і загадчыка аддзела старажытнабеларускай культуры Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Барыса Лазукі. Узнагароджаны яны за навуковую і творчую працу па адраджэнні нацыянальнай культуры і асабісты ўнёсак у стварэнне экспазіцыі Музея гісторыі слуцкіх паясоў у Слуцку. Раней гэтая старонка нацыянальнай гісторыі і культуры была мала вядомая шырокай аўдыторыі.

Унікальная экспазіцыя створана ўсяго за паўтара года. Наведвальнікі музея могуць патрапіць у атмасферу XVIII стагоддзя, калі ствараліся знакамітыя рарытэты, і даведацца пра традыцыі вырабу паясоў не толькі ў Беларусі.

Сярод уганараваных спецыяльнай прэміяй Прэзідэнта — ансамбль песні і танца «Мядуніца» Магілёўскай абласной філармоніі, аўтарскі калектыў у складзе супрацоўнікаў Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі Алены Боганевай і Тамары Варфаламеевай, педагога Цэнтра дадатковай адукацыі «Ветразь» Кастрычніцкага раёна г. Мінска Мікалая Козенкі; калектывы мемарыяльнага комплексу «Брэсцкая крэпасць-герой», творчых майстэрань Цэнтра сучасных мастацтваў і Неглюбскага сельскага цэнтра ткацтва Веткаўскага раёна Гомельскай вобласці.

Прэмія прысуджана галоўнаму спецыялісту прадпрыемства «Мінская спадчына» Сяргею Багласаву, мастаку-скульптару, члену Беларускага саюза мастакоў Сяргею Бандарэнку, прафесару кафедры малюнка Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў Уладзіміру Ганчаруку і інш.

**Міра ІЎКОВІЧ**